9 жніўня 2018 года пажылыя валанцёры Ганна Грышан, Галіна Казакевіч, Тамара Карповіч і супрацоўнікі двух аддзяленняў ГУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» наведалі жыхароў аддзялення кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў аг. Жупраны. Гадзіна зносін пад такой прыгожай назвай «Ганаруся табой, Беларусь!» была прымеркавана году малой радзімы. Тут гучала жывая музыка і душэўныя спевы аб нашым родным краі. Прыемным сюрпрызам для жыхароў ОКП, стала фізкультхвілінка, якую ў чарговы раз з імі правяла былы медык Ганна Грышана. Пажылыя валанцёры лічаць, што просты чалавечы ўдзел у жыцці іншага чалавека, клопат адзін пра аднаго - важная і неабходная частка жыцця кожнага грамадзяніна.





